УДК 811.161.3

# Народныя традыцыі ў беларускіх афарызмах

Гаўрош Н.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

У афарызмах заключаны найвялікшыя каштоўнасці чалавека, яго этычныя і эстэтычныя прынцыпы, духоўнасць, культура, традыцыі.

Беларусы ацэньваюць чалавека па яго духоўных якасцях, адносінах да іншых людзей, да ўсведамлення свайго месца ў грамадстве: *Глядзіце зверху ўніз на травы / Ці на ваду, / Не на людзей* (П. Панчанка); *Сцеражыце ж годнасць чалавечую. / Як жыццё, яна ў нас – адна* (Л. Геніюш). Мудрыя, назіральныя, унікальныя знаўцы жыцця, беларусы праз афарызмы перадаюць свету свае высновы, парады: *Ад здрадлівага – сэрцам адыдзі, / Ад цыніка – свой смутак уратоўвай,/ Зайздрослівага шчодра не віні, – / Жыві праўдзіва – усяго і толькі...* (В. Аколава); *Але раз ты наважыў дзела, / Ідзі станоўча, роўна, смела, / Ідзі, назад не аглядайся / І на другіх не пакладайся* (Я. Колас); *Балючай раны не дражні, / мудрым будзь, ды не мудруйся* (К. Кірэенка).

На Беларусі спрадвеку шанавалі добрых работнікаў, умельцаў: *Без мазаля чалавека спрадвеку / Не лічаць у нас, не завуць чалавекам* (М. Рудкоўскі); *Аддзячыць поле табе, аддзячыць, / Аддасць гарою калосны дар; / Яму вось толькі адчуць і ўбачыць, / Што ты не госць тут, а гаспадар!..* (А. Жамойцін); *Дзень, што пражыты без працы ахвярнай, / Знікне таксама ў шумлівасці марнай* (А. Зарыцкі); *Я па тым цаню суседа, / Як наклёпана каса* (Я. Янішчыц); *То – не рукі, якім працаваць не карціць, / То – не сэрца, што век ні па кім не баліць* (М. Танк).

Афарызмы настойліва рэкамендуюць пачынаць выхаванне дзяцей з самага ранняга ўзросту: *Вучы дзяцей яшчэ з пялёнак: каб не скаціцца пад адхон – хай з курганоў тваіх зялёных бяруць у заўтрае разгон* (Н. Гілевіч); *Сям'я ўратаваная – і ўратаваны народ* (Л. Рублеўская); *Гадуюцца дзеці ў любові – ратуецца вечнасць* (Л. Рублеўская). Падтрымліваючы разуменне месца і ролі маладога пакалення, беларуская афарыстыка сцвярджае: *А будучыня парасткам належыць, бо на дубах былых растуць яны* (У. Караткевіч); *Дзеці – радасць і прыгажосць усіх народаў свету* (Я. Брыль); *З учынкаў маладосці і старасць у людзей* (В. Аколава).

Як бачым, афарызм – надзвычай прыдатная моўная формула для таго, каб выказаць пэўныя высновы, акрэсленні, якія выспяваюць пасля доўгіх назіранняў і вопыту народа у цэлым.